**Курыловіч, Д.** У дзевятнаццаць няпоўных гадоў / Д. Курыловіч // Звязда (Пастаўскі р-н). — 1988. — 31 мая. — С. 2.

## У ДЗЕВЯТНАЦЦАЦЬ НЯПОЎНЫХ ГАДОЎ



Убачыш Сяргея Махніса сярод аднагодкаў, юнакоў, якім толькі-толькі за дваццаць і нічым не адрозніш ад іх. Такі ж юны твар, адкрытая ўсмешка, такія ж інтарэсы і захапленні. Вельмі маладыя яшчэ яны, прадстаўнікі сённяшняга пакалення людзей, якія прайшлі школу салдацкай службы, пачынаюць самастойнае жыццё. А многім жа, як і Сяргею, давялося прайсці нялёгкую і небяспечную службу ў няпоўных дзевятнаццаць гадоў у складзе абмежаванага кантынгента савецкіх войскаў у Афганістане.

І наш зямляк, выпускнік СШ № 1, Сяргей Махніс з гонарам вытрымаў суровы экзамен. Аб гэтым сведчыць высокая ўзнагарода – медаль «За баявыя заслугі», які ва ўрачыстыя дні носіць ён на лацкане пінжака побач з медалём «70 гадоў Узброеных Сіл СССР».

... У тую ноч на пазіцыю, якую займала аддзяленне пагранічнікаў, дзе нёс службу і Махніс, выйшла вялікая група ўзброеных праціўнікаў законнага ўрада Афганістана. Яны імкнуліся ў што б там ні стала прарваць акружэнне. Бой быў доўгі і нялёгкі для савецкіх воінаў. Але ніхто з іх не адступіў, праціўнік быў затрыманы. Пагранічнікі выйшлі з яго без страт. У далейшым і былі ўзнагароджаны медалямі.

Сёння, калі ідзе вывад савецкіх войскаў, якія выканалі свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане, дадому, Сяргей вельмі часта вяртаецца ў думках у родную часць, успамінае баявых сяброў, якія засталіся на гэтай шматпакутнай зямлі. Ён верыць у іх, верыць у іх вяртанне на Радзіму, хуткія сустрэчы.

Прайшло ўсяго некалькі месяцаў, як Сяргей Махніс закончыў тэрміновую службу ў Савецкай Арміі. Доўгіх ваганняў аб далейшым шляху не было. Вельмі шмат дала служба, вельмі многае звязана з ёю. І таму вырашыў Сяргей і далейшы свой лёс звязаць з арміяй, набыць прафесію ваеннага.

**Д. Курыловіч**

**На здымку: С. Махніс**

**Фота Д. Курыловіча**